УДК 37.06: 811.161.3

# ДА ПЫТАННЯ АБ ПРАВЯДЗЕННІ ВЫХАВАЎЧАЙ РАБОТЫ НА ЗАНЯТКАХ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ

*В. В. КУРЛОВІЧ*
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт транспарту, г. Гомель*

У артыкуле гаворыцца пра адзінства навучання і выхавання, фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці і грамадзянска-патрыятычных якасцей асобы.

Галоўным прынцыпам метадычнай канцэпцыі выкладання гуманітарных дысцыплін у вну тэхнічнага профілю з’яўляецца адзінства навучання і выхавання. Таму структура практычных заняткаў па дысцыпліне «Беларуская мова (прафесійная лексіка)» прадугледжвае знаёмства з творчай спадчынай класікаў беларускай літаратуры.

Традыцыйна ў рамках Дня беларускага пісьменства ў Беларускім дзяржаўным універсітэце транспарту праводзіцца тыдзень беларускай мовы, які прадугледжвае знаёмства з гісторыяй і культурай Беларусі. Мэтай дадзенага мерапрыемства з’яўляецца фарміраванне цэласнага ўяўлення аб вядомых беларускіх пісьменніках і асветніках, задача выяўляецца ў паглыбленні ведаў аб прадстаўніках беларускага пісьменства.

Для рэалізацыі пастаўленых задач студэнтам было прапанавана падрыхтаваць прэзентацыі, прысвечаныя юбілейным датам беларускіх пісьменнікаў «Яны мора збіралі па кроплях, як родную мову стваралі», што яшчэ раз дало магчымасць упэўніцца: Беларусь – гэта краіна з багатай літаратурнай спадчынай. Такім чынам, вызначаецца роля літаратуры ў працэсе сацыялагізацыі асобы, развіваецца пачуццё нацыянальнай самасвядомасці на аснове павагі да беларускай мовы як асноўнай формы самаідэнтыфікацыі асобы.

Пазнаёміцца з гісторыяй свята дапамаглі прэзентацыі, прысвечаныя Дню беларускага пісьменства «Беларусь! Ты збудавана з беларускіх слоў», якія распавядалі пра месца і гісторыю правядзення свята.

Таксама студэнты мелі магчымасць далучыцца да прыгажосці беларускага слова, паўдзельнічаўшы ў конкурсе чытальнікаў «Вы паслухайце родную мову! Жаўруковаю песняй звініць», што дазволіла ўспрымаць уласную нацыянальнай культуру як культуру са сваімі традыцыямі. Для завучвання на памяць прапанаваліся творы класічнай літаратуры, якія маюць магутны духоўна-культурны патэнцыял і выяўляюць высокія маральна-этычныя традыцыі беларускага народа.

Для праяўлення ўласных творчых здольнасцей быў праведзены конкурс сачыненняў-эсэ «Люблю цябе такой, якая ёсць, зямля мая, зямля бацькоў

святая!», дзе праз самастойныя пошукі і асэнсаванне студэнты змаглі паразважаць пра свае адносіны да роднага краю, адказнасць перад будучыняй за захаванне сваёй краіны. Можна адзначыць, што падрыхтоўка вусных і пісьмовых паведамленняў па адпаведных спецыяльных тэмах выпрацоўвае ў студэнтаў навыкі лагічнага і дакладнага выказвання ўласных думак у арыентацыі на ўзоры літаратурнай мовы. Была праведзена выстава творчых работ студэнтаў на тэму: «Ёсць прыгожае месца на гэтай зямлі, родным краем яго называем».

Паколькі падчас правядзення тыдня беларускай мовы ў краіне адзначаўся Дзень маці, былі падрыхтаваны прэзентацыі «Падзякаваць трэба той матчынай песні, з якой пачынаецца наша жыццё». Матэрыял быў прысвечаны значнасці асобы маці ў творчасці беларускіх пісьменнікаў і ў жыцці кожнага чалавека.

У сучасных умовах асобую значнасць набывае грамадзянска-патрыятычнае выхаванне моладзі, узрастае роля ўстаноў адукацыі па выхаванні грамадзян Рэспублікі Беларусь. Выхаваўчая работа накіравана на тое, каб вырасціць чалавека, які любіць свой народ, сваю Радзіму, паважае традыцыі сваёй краіны. Для гэтага неабходна не толькі даць веды, якія садзейнічаюць фарміраванню адпаведных ідэалаў, але і развіць духоўныя якасці асобы – грамадзяніна сваёй краіны. Прэзентацыі «Жыву ў Беларусі і тым ганаруся», «З гісторыі ўзнікнення галоўных сімвалаў Беларусі» (сцяг, герб, гімн), урачыстае выкананне гімна Рэспублікі Беларусь спрыялі фарміраванню грамадзянска-патрыятычных якасцей асобы і нацыянальнай самасвядомасці на аснове дзяржаўнай ідэалогіі.

Такім чынам, выхаваўчы працэс на практычных занятках па беларускай мове набывае асаблівую актуальнасць у фарміраванні глыбінных уяўленняў пра сутнасць грамадскіх ідэалаў. Патрыятычнае выхаванне на занятках дапаможа сфарміраваць асобу, якая паважае сваю мову, свой народ, Радзіму, традыцыі.

*V. V. KURLOVICH*
*Belarusian State University of Transport, Gomel*

**ON THE ISSUE OF CONDUCTIHG SOCIALLY EDUCATIONAL WORK WITHIN THE BELARUSIAN LANGUAGE LESSONS**

The article deals with the unity of education and instruction, the formation of national identity and civil-patriotic qualities of the individual.

Получено 09.02.2021